# ПРАТАКОЛ ПАСЯДЖЭННЯ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ

25 красавіка 2024 года

На пасяджэнні камісіі прысутнічаюць: Андрэй Атаманчук, Алена Філатава, Яраслаў Бекіш, Алена Прыходзька, Альвіна Мінгазава, Дзмітрый Лазавік.

У сілу п. 4.11 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную Раду для прыняцця рашэнняў неабходны кворум павінен складаць 2/3 ад колькасці чальцоў Выбарчай камісіі. Неабходная колькасць сяброў Выбарчай камісіі прысутнічае – 6 чалавек. Кворум выкананы.

Пасяджэнне Выбарчай камісіі аб'яўляецца адкрытым.

На пасяджэнні Выбарчай камісіі прысутнічаюць сябры Выбарчай камісіі з правам голасу, а таксама сябры сакратарыята Выбарчай камісіі, якія з'яўляюцца непублічнымі асобамі, аказваюць тэхнічную дапамогу Выбарчай камісіі, у тым ліку складаюць пратакол пасяджэння Выбарчай камісіі, аднак правам галасы не валодаюць.

**Парадак дня:**

1. Зацвярджэнне парадка дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 25 красавіка 2024 года.
2. Агульнае рашэнне аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў. Прынеццце рашэння па спісе “За годнасць беларусак”.
3. Лёсаванне ў якім парадку выбарчыя спісы будуць прадстаўлены ў нашых выбарчых білюценях.
4. Пытанне гендэрнай квоты.

**Разгляд пытання №1.**
Зацвярджэнне парадку дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 25 красавіка 2024 года.
Заўваг ад сяброў выбарчай камісіі не паступіла.
Па пытанні № 1 прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Зацвердзіць парадак дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 25 красавіка 2024 года.

**Разгляд пытання №2.**
СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні агульнага рашэння аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў:

“У адпаведнасці з палажэннем аб выбарах в Каардынацыйную Раду, выбарчая камісія рэгіструе ўсе выбарчыя суб’екты, якія адпавядаюць патрабаванням пералічаным у п. 3.2. палажэння. У прыватнасці ў п. 3.2.3. і п. 3 замацавана падаваць спіс не менш за 10 кандыдатаў, таксама ўсе патрабаванні да саміх кандыдатаў выкладзены ў п. 5 Палажэння. Да нас паступілі 13 спісаў. Гэта “Закон і правапарадак”, “Незалежныя беларусы”, “Салідарнасць”, грамадскі рух “Краіна для жыцця”, “Каманда Латушкі і рух “За свабоду”, блок Пракоп’ева-Егорава, “Еўрапейскі выбар”, “Воля”, аб’яднанне “Наша справа”, “Голас дыяспар. Адзінства па-над межамі”, “Хопіць баяцца”, “За годнасць беларусак”. У нас было раней прынята рашэнне аб дапушчэнню да выбараў 4 спісаў:

- “Незалежныя беларусы” у складзе 17 чалавек, лідар Максім Шабуцкі; “Краіна для жыцця”, 17 чалавек з улікам таго, што 1 чалавек выбыў, лідар Віталь Савюк;
- “Закон і правапарадак”, 20 чалавек, лідар Аляксандр Азараў;
- “Салідарнасць”, 21 чалавек, лідары Георгій Дзмітрук і Яўген Вільскі.

На сёння на разгляданне засталося 9 спісаў.
Пераходзім да разглядання спісаў.

Першым разглядаем спіс “Хопіць баяцца”, 14 чалавек, лідар Таццяна Мартынава. Гэты спіс даслаў усе неабходныя дакументы, па спісе была праведзена дадатковая асабістая верыфікацыя. Заўваг да спісу на бягучы момант няма.”

Галасаванне за допуск спісу “Хопіць баяцца” да выбараў.
Прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Дапусціць спіс “Хопіць баяцца” да выбараў.

“Спіс “Голас дыяспар. Адзінства па - над межамі”, у складзе 13 чалавек, лідар спісу Надзея Нортан. Гэты спіс таксама даслаў неабходныя дакументы, верыфікацыя была праведзена. Заўваг не выяўлена.”

Галасаванне за допуск спісу “Голас дыяспар. Адзінства панад межамі” да выбараў.
Прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Дапусціць спіс “Хопіць баяцца” да выбараў.

“Наступны спіс “Моладзевы наступ”, 15 чалавек, лідар спісу Лізавета Пракопчык. Гэты спіс таксама даслаў нам усе неабходныя дакументы. Па ім была праведзена дадатковая асабістая верыфікацыя і ніякіх заўваг выяўлена не было.”

Галасаванне за допуск спісу “Моладзевы наступ” да выбараў.

Прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Дапусціць спіс “Моладзевы наступ” да выбараў.

“Наступны спіс “Воля”, лідар спісу Вадзім Кабанчук, першапачаткова спіс складаўся з 21 чалавека, учора па ўласнаму жаданню аднаго з чальцоў спіса і па запыту лідара спіса, адзін чалавек выйшаў, такім чынам засталося 20 чалавек. Гэты спіс ідзе па квоце 20 %, пацверджэнні дадзенай квоты былі дасланы. Усе астатнія дакументы ў нас ёсць у наяўнасці. Верыфікацыя была праведзена. Заўваг няма.”

Галасаванне за допуск спісу “Воля” да выбараў.
Прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Дапусціць спіс “Воля” да выбараў.

Наступны спіс “Блок Пракоп’ева-Егорава”, 35 чалавек, лідар спісу Вадзім Пракоп’еў. Мы не называем прозвішчы асобаў, якія выдаляюцца са спіса. Адзін чалавек, каторы ідзе ў спісе пад нумарам 32 не даслаў нам свае асабістыя дадзеныя і тэрмін прыёма дадзеных ужо скончаны. Стаўлю пытанне аб выключэнні гэтага чалавека са спісу праз невыкананне працэдуры і далейшай немажлівасці яе выканаць.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні агульнага рашэння аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў:

“Ці гэта паўплывае на ўвесь спіс агулам, напрыклад, праз гендэрныя квоты?”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні агульнага рашэння аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў:

“Гэта не паўплывае на спіс агулам, спіс вялікі 35 чалавек.”

Галасаванне за выдаленне асобы пад нумарам 32 са спісу “Блок Пракоп’ева-Егорава”, які не даслаў свае дакументы:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Выдаліць асобу под нумарам 32 са спісу “Блок Пракоп’ева-Егорава”, які не даслаў свае дакументы.

«Таксама ў гэтым спісе былі 3 асобы і камісія запытвала ў іх дадатковыя звесткі, тлумачэнні, дакументы, таму што імёны, прозвішчы часткова альбо цалкам не супадалі з заяўленымі ў спісе. Даслалі неабходныя дакументы. Чальцы камісіі азнаёміліся з імі. Гаворка ідзе пра нумары ў спісе 11, 12, 19. Усім калегам, якія

прысутнічаюць тут вядомы акалічнасці гэтага і каб не распаўсюджваць асабістыя звесткі, прашу калегі альбо выказацца, альбо зацвердзіць што намі гэтыя акалічнасці прыняты і да гэтых асобаў у нас няма пытанняў».

Галасаванне за зацверджанне асоб пад нумарамі 11, 12, 19 у спісе "Блок Пракоп'ева-Егорава":
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Зацвердзіць асоб пад нумарамі 11,12, 19 у спісе "Блок Пракоп'ева-Егорава".

«Спіс «Блок Пракоп'ева-Егорава» быў у складзе быў у складзе 35 чалавек. Мы зараз прагаласавалі за тое, каб 1 чалавек быў выдалены. Гэты спіс не мае заўваг і таксама праходзіў выбарачную верыфікацыю.»

Галасаванне за допуск спісу "Блок Пракоп'ева-Егорава" да выбараў.
Прагаласавалі:
"За" - 5 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 1 галас.
ВЫРАШЫЛІ: Дапусціць спіс "Блок Пракоп'ева-Егорава" да выбараў.

"Далей спіс "Каманда Латушкі і рух "За свабоду". Спіс у складзе 47 чалавек. Лідары спісу Павел Латушка і Юрый Губарэвіч. Адзін чалавек, які значыцца ў спісе пад нумарам 32 па асабістым запыце быў выдалены са спіса. Гэты спіс даслаў нам усе неабходныя дакументы і па ім таксама была праведзена дадатковая асабістая верыфікацыя. Заўваг выяўлена не было."

Галасаванне за допуск спісу "Каманда Латушкі і рух "За свабоду" да выбараў.
Прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Дапусціць спіс "Каманда Латушкі і рух "За свабоду" да выбараў у складзе 46 чалавек.

"Далей разглядаем спіс "Еўрапейскі выбар", 37 чалавек, лідар спісу Аляксандр Дабравольскі. Адзін чалавек у спісе пад нумарам 30 не даслаў нам свае дадзеныя, таму стаўлю пытанне аб выдаленні дадзенага/гэтага чалавека са спісу праз тое, што мы не атрымалі ад яго дадзеных праз асабісты верыфікацыйны код."

Галасаванне за выдаленне асобы пад нумарам 30 са спісу "Еўрапейскі выбар", які не даслаў свае дакументы:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Выдаліць асобу под нумарам 30 са спісу "Еўрапейскі выбар", які ні не даслаў свае дакументы.

“Наступнае пытанне па гэтым спісе. Чалец нумар 33 цягам дадатковай праверкі не пацвердзіў наяўнасць у яго беларускага грамадзянства, якое адпаведна Палажэнню аб выбарах з’яўляецца важным чыннікам. Таму прашу выказацца па гэтым пытанні.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні агульнага рашэння аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў:

“Удакладняю, выдаленне гэтых людзей з гэтага спісу не ўплывае на гендэрныя квоты і не цягне за сабой больш буйных змен у спіс.”

Галасаванне за выдаленне асобы пад нумарам 33 са спісу “Еўрапейскі выбар”:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Выдаліць асобу под нумарам 33 са спісу “Еўрапейскі выбар”.

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні агульнага рашэння аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў:

“Ёсць пытанні па нумару 2 з гэтага спіса. Прозвішча якое заяўлена ў спісе не адпавядае прозвішчу, якое заяўлена ў пашпарце. Таму выбарчая камісія запрашвала дадатковыя звесткі, дадзеныя і тлумачэнні. Хоча хтосьці з калег выказацца?”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні агульнага рашэння аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў:

“У нас ёсць асобая група ўдзельнікаў спісу, якія з’яўляліся да 2020 году вядомымі асобамі і выступалі пад псеўданімамі, прозвішчамі, нікнеймамі, пазыўнымі. Нам трэба прыняць адзіны стандарт, калі яны ў спісе пазначаюць змененыя імёны, прозвішчы, дапоўненыя, кароткія і так далей па якім мы будзем працаваць. Трэба зразумець, што яўляецца нашым стандартам. У якіх выпадках мы робім выключэнні, у якіх не. Гэта проста пакуль кантэкст. У дадзеным выпадку мы маем справу з асобай, якая менавіта такой і з’яўляецца - шырока вядомай. Гаворка ідзе пра ўказанне няпоўнага прозвішча, бо яно падвойнае, а ў нас толькі адна з яго частак. Да нас паступіў запыт, каб зрабіць выключэнне і абгрунтаванне, чаму мы гэта выключэнне павінны зрабіць. Маё меркаванне да таго, як мы гэта прадэбатуем паміж сабой, я лічу, што гэты запыт досыць абгрунтаваны. Мы можам зрабіць такое выключэнне, але толькі ў такім выпадку, калі гэта не будзе супярэчыць агульнаму падыходу. То бок, калі мы зараз зробім такое выключэнне, то мы такімі ж аргументамі мусім потым кіравацца, калі будзем разглядаць іншыя пытанні.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Альвіну Мінгазаву па пытанні агульнага рашэння аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў:

“У мяне як у юрыста больш фармальны падыход. Калі няма дакумента, які пацвярджае, што прозвішча змянялася або прозвішча ўжо зменена, але пашпарт не зменены, то ў спісе прозвішча павінна супадаць з інфармацыяй, якая пазначана ў пашпарце або ў іншым дакуменце, які сведчыць асобу.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Дзмітрыя Лазавіка па пытанні агульнага рашэння аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў:

“Я хацеў бы дадаць, што мы агульны падыход ужо ўзгаднілі, мы абавязаны ў мэтах ідэнтыфікацыі чалавека зазначыць яго рэальная прозвішча як у пашпарце, які быў прадстаўлены для верыфікацыі. Калі гэтая асоба з’яўляецца публічнай, то мы па жаданню гэтага чалавека можам указаць яго псеўданім, альбо калі ў яго рэальнае прозвішча падвойнае, то тую частку, напрыклад, дзявочае прозвішча ў якасці псеўданіма, бо гэта асоба пад псеўданімам альбо пад гэтым прозвішчам вядома для шырокага кола выбаршчыкаў. Падыход такі, што рэальнае прозвішча мусіць быць указана.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні агульнага рашэння аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў:

“Для мяне гэта быў складаны кейс. Я прыбрала асабістыя эмоцыі, амбіцыі, стаўленне да чалавека, проста паспрабавала быць лаяльнай, даць магчымасць. Але я вымушана канстатаваць, што юрыдычны бок мяне пераконвае ў тым, што ёсць парушэнні, і калі мы прытрымліваемся прынцыпу – аднолькавыя правілы для ўсіх, мы мусім кіравацца гэтым правілам для ўсіх адпаведна. Мы фіксуем парушэнне. Пад пытаннем наяўнасць гэтага чалавека ў спісе.”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні агульнага рашэння аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў:

“Тыя тлумачэнні, якія былі нам прадастаўлены з чалавечага пункту гледжання насамрэч слушныя, мы з павагай да гэтага ставімся, але зараз мы ўсе ствараем прэцэдэнт і асабліва ў выпадку, калі персона знакамітая, мы падпадаем усе пад падвоены прыцэл і разгляд, і магчымасці прымянення пэўных маніпуляцый да нас, абвінавачанні ў тым, што мы не роўна ставімся да астатніх, таму што падобнае пытанне было і ў іншым спісе. Але там акурат нам былі дасланыя звесткі лідарам спіса і саміх носьбітаў гэтых прозвішчаў. Мы пагадзіліся з тым, што мы ўказваем так, як ёсць у пашпарце і таксама дадаем яшчэ тое прозвішча, пад якім асоба хоча быць агучана і такім чынам кампраміс дасягнуты.”

Галасаванне за выдаленне асобы пад нумарам 2 са спісу “Еўрапейскі выбар”, які не даслаў свае дакументы:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Выдаліць асобу под нумарам 2 са спісу “Еўрапейскі выбар”.

“Па астатнім спісе была праведзена дадатковая верыфікацыя і цягам гэтых працэдур ніякіх іншых заўваг не было.”

Галасаванне за допуск спісу “Еўрапейскі выбар” да выбараў у складзе 34 чалавек.
Прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Дапусціць спіс “Еўрапейскі выбар” да выбараў.

“Пераходзім да наступнага спісу. Гэта спіс “Наша справа” у складзе 14 чалавек, лідар спісу Роза Турарбекава. Гэты спіс даслаў нам усе неабходныя дакументы. Паім была праведзена дадатковая праверка. І цягам гэтых працэдур заўваг да спісу не ўзнікла.”

Галасаванне за допуск спісу “Наша справа” да выбараў у складзе 14 чалавек.
Прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Дапусціць спіс “Наша справа” да выбараў.

“Спіс “За годнасць беларусак”  мы разглядаем асобна. Лідарка спісу – Яраслава Грыгор’еў. Лідарка спісу пазіцыянуе сябе як трансгендерная жанчына.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Альвіну Мінгазаву па пытанні агульнага рашэння аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў:

“Выбарчая камісія абапіраецца на палажэнне аб выбарах у Каардынацыйную раду. Хачу нагадаць аб п. 3.2 дадзенага палажэння - выбарчая камісія рэгіструе ўсе выбарчыя суб'екты, якія адказваюць пэўным патрабаванням. А менавіта, суб'ект павінен мець назву, палітычную праграму на тэрмін не меншы, чым тэрмін Каардынацыйнай рады новага складу і дэкларуе каштоўнасці на падставе якіх быў сфармаваны выбарчы суб'ект. Таксама неабходна падаць спіс не менш, чым з 10 кандыдатаў, якія выказалі згоду на ўдзел у выбарах і забяспечыць гендэрную квоту, а таксама прадаставіць пісьмовую згоду ўсіх кандыдатаў спісу з Мемарандумам аб прынцыпах удзелу ў выбарчай кампаніі. Патрабаванні да кандыдата ў дэлегаты ў Каардынацыйную раду выкладзены ў п. 5 гэтага ж палажэння. Пасля вывучэння дакументаў, прадстаўленых лідэрам "За годнасць беларусак", у лідэра дадзенага спісу адсутнічае грамадзянства Рэспублікі Беларусь, што не адпавядае вышэйпаказаным крытэрам для выбарчага суб'екта, якія пазначаны ў палажэнні аб выбарах. Асоба без беларускага грамадзянства

павінна быць выключана са спісу выбарчага суб'екта. У сувязі з тым, што спіс налічвае 10 чалавек, пасля выключэння застаецца меншы лік чым 10, і гэта не адпавядае п. 3.2.3. палажэння. Унясенне змен у спіс пасля 20 красавіка з'яўляецца немагчымым. 23 красавіка выбарчая камісія накіроўвала ліст аб дапаўненні інфармацыі, лідэр спісу пацвердзіў, што грамадзянства Рэспублікі Беларусь у яго адсутнічае і прасіў выбарчую камісію пайсці на саступкі і зрабіць пэўныя выключэнні. У якасці прычын, якімі абгрунтоўвалася дадзеная пазіцыя, былі названыя пэўныя заслугі і таксама змяшчалася просьба аб замене дадзенай асобы ў спісе на іншую асобу. Выбарчая камісія не мае паўнамоцтваў уносіць змены ў палажэнне аб выбарах. Прыняцце такога рашэння было б дыскрымінацыяй у адносінах да іншых суб'ектаў. Я прашу адмовіць у рэгістрацыі выбарчага суб'екта "За годнасць беларусак".

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні агульнага рашэння аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў:

“Там да нас быў зварот, што гэты чалавек зрабіў значны ўнёсак у беларускую справу. Але ў нас такога крытэрыя… Выключыць са спіску.”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні агульнага рашэння аб рэгістрацыі выбарчых суб’ектаў:

“Замяніць нікога някім мы не можам на дадзеным этапе. Новыя чальцы не дадаюцца.”

Галасаванне за выключэнне лідаркі спісу Яраславы Грыгор’ева з выбарчага працэсу праз тое, што яна не можа пацвердзіць беларускае грамадзянства.
Прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Выключыць лідарку спіса Яраславу Грыгор’еў з выбарчага працэсу.

Галасаванне аб адмове ў рэгістрацыі спісу “За годнасць беларусак” праз немагчымасць выканання патрабавання наяўнасць мінімальна 10 чальцоў у спісе.
Прагаласавалі:
"За" - 6 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Адмовіць у рэгістрацыі спісу “За годнасць беларусак” праз немагчымасць выканання патрабавання наяўнасць мінімальна 10 чальцоў у спісе.

**Разгляд пытання №3.**
Лёсаванне ў якім парадку выбарчыя спісы будуць прадстаўлены ў нашых выбарчых білюценях.

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Зьмітра Лазавіка па пытанні лёсавання:

“Я зараз падзялюся сваім экранам. Я надрукаваў запыт для чата GPT, каб ён выпадковым чынам надаў кожнай назве ў двукоссі парадкавы нумар ад 1 да 12. І зараз спісы:

- “Закон і правапарадак”;
- “Незалежныя беларусы”;
- “Аб’яднанне палітычных партый Народная грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя “Салідарнасць”;
- “Грамадскі рух “Краіна для жыцця”;
- “Каманда Латушкі і Рух “За свабоду”;
- “Блок Пракоп’ева-Ягорава”;
- “Еўрапейскі выбар”;
- “Воля”;
- “Аб’яднанне “Наша справа”;
- “Моладзевы наступ”;
- “Голас дыяспар – адзінства па-над межамі”;
- “Хопіць баяцца”.

Я скапіяваў гэты тэкст і зараз раблю запыт для чата GPT. Чат проста выдае нам лічбы. Такім чынам, лічу, што галасаванне адбылося. Такім чынам,

- “Закон і правапарадак” атрымлівае нумар 5;
- “Незалежныя беларусы” атрымліваюць нумар 7;
- “Аб’яднанне палітычных партый Народная грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя “Салідарнасць” атрымліваюць нумар 1;
- “Грамадскі рух “Краіна для жыцця” нумар 11;
- “Каманда Латушкі і Рух “За свабоду” нумар 9;
- “Блок Пракоп’ева-Ягорава” нумар 8;
- “Еўрапейскі выбар” нумар 3;
- “Воля” нумар 2;
- “Аб’яднанне “Наша справа” нумар 4;
- “Моладзевы наступ” нумар 12;
- “Голас дыяспар – адзінства па-над межамі” нумар 6;
- “Хопіць баяцца” нумар 10.

Скрын я дасылаю ў наш працоўны чат і спыняю скрыншэрынг свой.”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні лёсавання:

“Я зацвярджаю, што галасаванне адбылося і пасля гэтай трансляцыі мы абавязкова хутка зробім абдэйт і ўсё гэта ў надрукаваным выглядзе выдадзім

абавязкова. І віншую ўсе выбарчыя суб’екты, якія зацверджаны пад наступнымі нумарамі:

- “Закон і правапарадак” атрымлівае нумар 5;
- “Незалежныя беларусы” атрымліваюць нумар 7;
- “Аб’яднанне палітычных партый Народная грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя “Салідарнасць” атрымліваюць нумар 1;
- “Грамадскі рух “Краіна для жыцця” нумар 11;
- “Каманда Латушкі і Рух “За свабоду” нумар 9;
- “Блок Пракоп’ева-Ягорава” нумар 8;
- “Еўрапейскі выбар” нумар 3;
- “Воля” нумар 2;
- “Аб’яднанне “Наша справа” нумар 4;
- “Моладзевы наступ” нумар 12;
- “Голас дыяспар – адзінства па-над межамі” нумар 6;
- “Хопіць баяцца” нумар 10.”

**Разгляд пытання №4.**
СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні гендарнай квоты:

“Чальцы са спісаў могуць выдаляцца па розных абставінах. Нам трэба для сябе і для выбарчых суб’ектаў патлумачыць працэдуру, як будуць карэктавацца спісы з улікам таго, што чалец выбывае і з улікам таго, што павінна быць выканана гендарная квота.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Дзмітрыя Лазавіка па пытанні гендэрнай квоты:

“Я выкажу агульную думку, таму што папярэдне мы гэта пытанне абмяркоўвалі. Калі выбывае са спісу адзін з кандыдатаў, мы мусім змяніць спіс такім чынам, каб у кожнай пяцёрцы з якой кандыдат выбыў з усіх наступных пяцёрак, каб у іх выконвалася гендерная квота. Мы мусім адпаведным чынам пераставіць кандыдатаў. Калі з пяцёркі выбыла адна жанчына, то мы на месца гэтага кандыдата ставім за ёй бліжэйшую жанчыну. І такім чынам карэктуем увесь спіс. Вось такая прапанова.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні гендэрнай квоты:

“Мы пробавалі розныя варыянты. І распрацавалі такую мадэль, таму што мы не маем права ўносіць змены ў спісы, якія нам падалі. Мы не хочам парушыць правы тых, хто прымае ўдзел ў выбарчай кампаніі. Такой механізм замены і не парушэння гендэрнай квоты мне падаецца максімальна аптымальным. Адзін з

чальцоў выбыў з нашага пасяджэння – Яраслаў Бекіш. Але тым не менш без яго ўдзелу ў нас ёсць кворум. Рашэнні з’яўляюцца правамочнымі.”

Галасаванне за такую мадэль карэкціроўкі спісаў, калі адна жанчына выбывае, то на яе месца ставім бліжэйшую жанчыну.
Прагаласавалі:
"За" - 5 галасоў, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Зацвердзілі мадэль карэкціроўкі спісаў, калі адна жанчына выбывае, то на яе месца ставім бліжэйшую жанчыну

Пасяджэнне абвешчана закрытым.